***В. А. Караткевіч***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## КАХАННЕ НА ФОНЕ ГАРАДСКОГА ПЕЙЗАЖУ ЛЕАНІДА ДРАНЬКО-МАЙСЮКА

Горад як аб'ект мастацкага адлюстравання і эстэтызацыі ў беларускай паэзіі ўпершыню з'явіўся ў творчасці Максіма Багдановіча. Пасля 20-х гг. ХХ ст., па слушнай заўвазе Сяргея Кавалёва, «наступныя трыццаць гадоў не прынеслі беларускай паэзіі ў распрацоўцы тэмы горада ніякага плёну» [1, с. 19]. Своеасаблівай кропкай адліку ў вяртанні ўрбаністычнай тэматыкі ў беларускую паэзію сталася кніга Міхася Стральцова «Ядлоўцавы куст» (1973). На сённяшні дзень у беларускай паэзіі творы ўрбаністычнага зместу – даволі прыкметны тэматычны пласт, яны паўнавартасна ўводзяць нас у космас горада, пакрысе разбураюць стэрэатып пра абсалютную вясковасць паэзіі ХХ стагоддзя і погляд на беларусаў як выключна сялянскую цывілізацыю.

Адным з прадстаўнікоў сучаснай айчыннай урбаністычнай паэзіі з'яўляецца Леанід Дранько-Майсюк. Паэт спалучае тэму горада з любоўнай тэматыкай, чым надае арыгінальнасці сваім вершам. Гарадскія пейзажы ў зборніках «Акропаль» і «Стомленасць Парыжам» дэманструюць чытачу пейзажы горада ў рамантычна-ўзнёслым ключы. Л. Дранько-Майсюк звяртаецца да плённага выкарыстання стылістычных прыёмаў мадэрнізму, імпрэсіянізму і сімвалізму. Паэт, у процівагу абагульненасці ўрбаністычных краявідаў большасці калег па пяру, адметна выкарыстоўвае прыём геаграфічнай канкрэтызацыі. Як прыклад, варта ўзгадаць верш «На вуліцы Сухой у змроку радасным... »: «*На вуліцы Сухой у змроку радасным // Мы дыхалі забытаю лавандай, // Лагчынаю прыйшлі ў завулак Транспартны // І дом убачылі з бярозай і верандай…*» [2]. Урбаністычныя мазкі здаюцца звычайнымі і лёгкімі, яны не парушаюць сабой нічога, толькі існуюць на фоне лірычных герояў. Фларыстычныя вобразы ў гэтым вершы з'яўляюцца ўвасабленнем квітнеючага жыцця, кахання, абавязкова ўзаемнага, пяшчоты. Жанчына і каханне ў гэтым вершы пахнуць лавандай. Яшчэ адзін верш, які нельга пакінуць па-за ўвагай у дадзеным кантэксце, – «Заслона спалена, і сон сышоў у сонь... ». У ім выразна раскрываецца асабістасць творчасці паэта, тое, як ён па-майстэрску яднае каханне з гарадскім фонам, як падкрэслівае дэталі і настрой, ствараючы каларытны малюнак з пачаткамі сюжэту: «*З балкона, з галубінага гаўбца // Глядзеў я на пусты праспект Скарыны, // А бачыў вуліцу і плошчу Казінца // І выхад твой з тралейбуснай цясніны*» [2].

Такім чынам, Леанід Дранько-Майсюк не спыніўся на блізкай яму любоўнай лірыцы, адчуў урбаністычны пейзаж і яго роднасць да сваёй творчасці, тым самым не толькі надаў сваім вершам арыгінальнасць і навізну, але і падаў іншы погляд на вядомыя жанры. Паэт звярнуўся да плённага выкарыстання стылістычных прыёмаў мадэрнізму, імпрэсіянізму і сімвалізму. Арыгінальным з'яўляюцца і фларыстычныя вобразы, якія Л. Дранько-Майсюк вельмі ўдала ўжываў у сваіх вершах.

### Літаратура

1 Кавалёў, С. Як пакахаць ружу / С. Кавалёў. – Мінск : Выдавецтва ЦК КП Беларусі, 1989. – 79 с.

2 Дранько-Майсюк, Л. Акропаль [Электронны рэсурс] / Л. Дранько-Майсюк. – Рэжым доступу : https://www.rulit.me/books/akropal-read-423581-17.html. – Дата доступу : 10.04.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ